# Пазакласнае чытанне

# 3 клас

## Хрэстаматыя



# *Змест*


**Янка Купала........................................................3**

Верш «Юрачка»........................................................3
Верш «Вясна»........................................................5
Верш «Сыны»........................................................6

**Цётка........................................................9**

Нарыс «Чаму птушкі адлятаюць»........................................................9
Нарыс «Жаваранак»........................................................10

**Змітрок Бядуля........................................................17**

Казка «Скарб»........................................................17

**Алесь Гарун........................................................23**

«Добрыя дзеці»........................................................23

**Купальскія песні........................................................24**

**Масленічныя песні........................................................27**

**Беларускія народныя казкі........................................................30**

Казка «Жаронцы»........................................................30
Казка «Людзей слухай, а свой розум май»........................................................35
Казка «Стралец і рыбак»........................................................37
Казка «Каток – залаты лабок»........................................................41

**Легенды........................................................43**

Адкуль пайшлі беларусы........................................................43
Адкуль зязюля ўзялася........................................................45
Адкуль узяўся мядзведзь........................................................47

**Паданні........................................................48**

Добры Жыцень........................................................48
Паданне пра Жыцень........................................................50

**Народныя забаўлянкі........................................................51**

Сарока-варона........................................................51
Ладу-ладу-ладкі........................................................51
Кую-кую ножку........................................................52
Гоп-гоп, і-га-га........................................................52

**Народныя лічылкі........................................................53**

Раз, два, тры, чатыры........................................................53
Кацілася торба........................................................53
Энікі-бэнікі........................................................53

# Янка Купала

## Верш «Юрачка»

**1**

Ой ты, Юрачка,
Што не вучышся?
Так да невукаў
Ты далучышся.



А як вырасцеш
Ты няўмекаю,
Усе высмеюць
Недарэкаю[1].

А ў нашага Юрачкі
З’елі сала шчурачкі[2],
Як пабег ён у лясок,
Каб схавацца ад кніжок.



А ў нашага Юрачкі
У капоце[3] дзюрачкі,
Нарабіў ён іх сабе,
Як стаў лазіць па вярбе.

**2**

Ой ты, Юрачка,
Што лянуешся,
Хаткі нашае
Не пільнуешся?

[1] **Недарэка** – някемлівы, няўмелы чалавек.
[2] **Шчурачкі** (шчур) – невялікая птушка сямейства ўюрковых.
[3] **Капот** – устарэлае слова, устарэлы выраз. Жаночае хатняе плацце шырокага пакрою з рукавамі і разрэзам спераду.

Толькі бегаеш,
Забаўляешся,
Гэтак з кпінамі[1]
Напаткаешся.



* * *

А ў нашага Юрачкі
Пагублены гузічкі,
Ён тады іх пагубляў,
Як з садочку уцякаў.

А з нашага Юрачкі
Сталі кпіць і курачкі,
Што не мыўся цэлы дзень
І бубніць, як авадзень.



**3**

Ой ты, Юрачка,
Кінь ляніціся,
Ды надумайся
Ты вучыціся.

Будзем цешыцца,
Што ты вучышся
І да невукаў
Не далучышся.

[1] **Кпіны** – злыя, абразлівыя жарты, насмешкі над кім-, чым-небудзь.

# Верш «Вясна»

Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы,
Болей не мерзне душа ні адна,
Сонейкам цёпленькім, зеленню вабнаю
Абдаравала зямельку вясна.

Рэчкі бурлівыя, ўчора санлівыя,
Сёння ўсталі, плывуць і бурляць;
Рыбкі шмыглівыя скачуць, купаюцца,
К небу прыветна з вадзіцы глядзяць.



Пушчы паважныя, зімку праспаўшыя,
Радасна песні зайгралі свае;
Лісці зашасталі, птушкі зачыркалі,
Свішча салоўка, і дзяцел клюе.

Поле травіцаю сочнай адзелася,
Выйшла скацінка і дружна скубе,
Каля скацінкі падпа́свіч з жалейкаю
Ходзіць навокал ды йграе сабе.

Грай, грай, жалеечка! Грай, грай, вясёлая!
Выйграй з вясною і долечку мне;
З пушчаю, з птушкамі, з вольнымі ветрамі
Грай мне аб шчасці, грай аб вясне!

# Верш «Сыны»



Сыноў бацька сваіх кліча
На параду ў хату,
А ўрачыста, як бы кліча
На якое свята.

І з павагаю пытае
Кожнага ў асобку,
Кім з іх кожны быці хоча,
Якім жыць заробкам.

*

– Бо, сыны мае, – так кажа,
Жывіцё ў краіне,
Чалавечая дзе праца
Намарна не гіне.

І сыны адказ трымалі
Перад бацькам родным,
А стараўся з іх быць кожны
Свайго бацькі годным.

*



Першы кажа: – Землі буду
Трактарам варочаць,
Каб рунелі, зелянелі,
Аж яснелі вочы.

Каб раслі ў рост чалавека
Жыта і пшаніца,
Каб аж госці к нам з-за свету
Ехалі дзівіцца.



*

Другі кажа: – На заводзе
Быць хачу даўно я,
Дзе чыгун ракою льецца,
Дзе звініць сталь звонам.

Будаваць буду дзень цэлы
Домны і мартэны[1],
Медзь і вугаль браць у дзела
Ад шахтаў падземных.

*



– Плаваць я пайду на мора,–
Сказаў гэтак трэці, –
Дзе «Чэлюскін» горда плаваў,
Дзе пурга, дзе вецер.

Ад халодных да гарачых
Мораў рэйс мой будзе.
Параход мой будзе грозна
Рэзаць хваляў грудзі.

*



Сын чацвёрты: – Хачу лётаць
Птушкаю крылатай,
Мерацць неба ў самалёце
Над тваёю хатай.

Арлянём сябе ў сне бачу,
Не знаю спакою…
Хачу быць я, мой ты бацька,
Лётчыкам-героем.

[1] **Домны і мартэны** – прамысловыя печы для выплаўкі чыгуну з жалезнай руды.

*

– Байцом буду я чырвоным, –
Пяты кажа гэтак, –
Сцерагчы граніцы-межы
Краіны Саветаў,

Каб наш вораг пры нападзе
Сустрэнуў магілу.
Байцом буду, каб з мяне быў
Рад сам Варашылаў.





*

А сын шосты: – Складаць песні
Буду, колькі змогі,
Пра вялікія падзеі...
Сталінскай эпохі

Як працуем, як знішчаем
Здрадныя напасці,
Як будуем, як ствараем
Казачнае шчасце.

*

Так сыны адказ трымалі
З гонарам юначым,
Свае выказаці думкі
Не ўмелі іначай.

Бальшавік быў іхні бацька,
Пралетарый родам,
Зведаў сушы, зведаў моры,
Бітвы і паходы.



# Цётка

## Нарыс «Чаму птушкі адлятаюць»

(урывак з апавядання «*Пералётныя птушкі*»)

Тыя птушкі, якія мусяць жыць вясну і лета ў адным краі, а восень або толькі часць восені і зіму ў другім краі, называюцца пералётнымі.

Птушкі на халодны час пералятаюць у цёплы край, бо яны ўсе жывяцца рабакамі[1], кузюркамі, жучкамі і т.п., а ўсе гэтыя страшэнныя ворагі нашых дрэў і раслін на зіму гінуць, дык птушкам не было б чым жывіцца.

Каб мог здарыцца такі год, што птушкам дзеля якой прычыны нельга было б вярнуцца да нас, якім жа страшным, глухім і спустошаным праз гэта стаўся б наш край: замест мілага шчэбету, замест песняў звонкіх, толькі голыя веткі і галіны шапацелі б, замест багатых рознакалёрных ніў – поле ляжала б, як чорны папар і т.д., бо ўсё багацце нашага краю зніштожылі б, аб’елі б жукі, рабакі, мошкі.



[1] **Рабак** – тут, гусеніца

# Нарыс «Жаваранак»

(урывак з апавядання «*Гутаркі аб птушках*»)

Сцюдзёна яшчэ малым дзеткам у хаце: большую палову дня жэўжыкі шыюць каля печы. Праўда, дзед штодня цешыць унукаў, быццам вясна ўжо блізка, што вось-вось ужо за гэтым лесам вялікім, што за рэчкай стаіць.



– Ужо прыйшла б, – кажа дзед, – але надта змучылася, ідучы здалёку, дык прылягла крыху на прыгорку і адпачывае.

– А як, дзядок, вясна выглядае? Да каго падобна? – дапытваюцца зацікаўленыя ўнукі.

– А такая маладая, пекная[1] паненка ў зялёнай сукенцы; таваркі[2] яе – розныя кветкі, пакорныя служкі – галасістыя птушкі. Ось, хутка прышле да нас некаторых з іх, прымерам, – жаваранка-песняра і кветку-пралесачку.

– А калі ж, дзедулёк, жаваранак прыляціць?

– А тады, як вы, жэўжыкі, па тры боханы хлеба з'ясцё.

– Дзедка, то мы будзем завіхацца.

– Вядома, завіхайцеся: на зарок[3] не адкладайце.

«Але, мусіць, то дзед жартуе, – думаюць дзеці, – бо якая тут вясна ідзе, калі дзед апранаецца ў кажух, на рукі пхне суконныя рукавіцы».

Нездарма сямілетні Юзюк, учарэпіўшыся дзеду за шыю, пытае:

– Ты, дзядуля, мусіць, апрануўся так цёпла, каб зіму хутчэй спудзіць?

– Э-э, будзеш і ты, жэўжык, калісьці таксама на старасць цёпла ўхутвацца, як і твой дзед, а цяпер адчапіся ад маёй шыі, бо ты ж не званок, а я не конь!

– Але затое ж я твой унучак, – бойка адказвае Юзюк, – і як прычаплюся да тваёй, дзедулёк, шыі, то так прырасту, як барадаўка да крывога носа.

---

[1] **Пекны** – размоўнае слова ***прыгожы***.

[2] **Таваркі** – сяброўкі.

[3] **Зарок –** абяцанне, клятва не рабіць чаго-небудзь або зрабіць што-небудзь.

– Ой, Божа мяне крый ад такога гумзака, як ты, Юзючок!

– Ну, то купі мне боты, дзедулёк.

– Што-о? боты?

– Але, боты такія, як у музыкі Банадыся.

– Ох, які ты здагадлівы, унучак! Вясна, як піць даць, стане на дварэ, мо ўжо жаваранкі заўтра запяюць, а ты ботаў захацеў.

– Дзядуля, дзедулёк, купі, купі, – ужо хліпаючы, прыстае ўнук.

– Цыц, дзіцятка! утры нос і перастаць хліпаць, як будзеш добры, паслухмяны, то мо жаваранак сам здагадаецца і прынясе табе боты.

– І мне, мне! – свіргоча[1] дзіцячая драбяза.

Марыля, Настка, Казюк чапляюцца за калені дзеда.

А дзед ходзіць па хаце, як стары баравік паміж суравежкамі.

– Дзядуля! Як той жаваранак прыляціць, то няхай мне хустачку прынясе чырвоную, – просіць Марыля.

– А мне – дудку і коніка, – ласіцца Казюк.

– Добра, дзеткі, добра, зараз выйду на падворак і гукну, каб усё маім унучкам малым жаваранак папрыносіў.

Дзед выходзіць скаціне даваць. Дзеці гуляюць па хаце і чакаюць яго. Дзед варочаецца:

– А што, дзядулю, ці сказаў жаваранку?

– Не, дзеткі, жаваранка я і не бачыў, бо толькі выходжу з хаты, манюся яму загадаць, ажно мароз, такі сівы, з вялікай, доўгай барадой, – цап мяне за рукі: «Не смей, – кажа, – клікаць жаваранка, абудзіш вясну, і зараз маю ўсю работу папсуе гэта нягодная баба. А ў мяне цяпер, – кажа, – найважнейшая справа ідзе: мост будую цераз вашу рэчку». – «А што мне за дзела да твайго моста, – адказваю, узлаваўшыся, – мне мае ўнукі бліжэйшыя, я для іх хачу жаваранка клікнуць». – «Ціха, пачакай, – кажа мароз, – я тваім унукам лепшых цацак пекных нарысую на вокнах, а жаваранак няхай яшчэ пасядзіць за морам».

– Дзедулёк! то жаваранак за морам? Раскажы нам, дзе ён?

– Раскажу пасля, цяпер не маю часу: трэ дровы на вячэру сеч. А вы, дзеткі, пакуль што пагуляйце, маткі слухайце, старшыя малодшых не крыўдзіце, а я зара вярнуся.

На дварэ сцяплела. Вада з стрэх капае. На полі лысеюць праталіны. Дзе якое дзіцянё вырвецца з хаты, шмыргае босае па вуліцы. Вераб'і

[1] **Свіргатаць –** шчабятаць.

юшкаюцца на сметніку. Слонка бліжэй глядзіць з неба. Дзед, чутно здалёку, шкулдыкае[1] ў вялікіх ботах: шлэмб, шлэмб. Перад дзедам ляціць Юзюк: крычыць, пішчыць, рукамі, нагамі выкідвае, галавой круціць, усё роўна як той жарэбчык-пярэзімак, сарваўшыся з прывязі.

– Жаваранак! Жаваранак прыляцеў! – крычыць.

– Ціха, не вый! Усё роўна што жару ў горла нахапаў, – сцішае маці, высунуўшы галаву праз дзверы.

Дзеці меншыя, як мышы, каторае бокам, каторае скокам, выкульваюцца ў сені.

– Пайшлі дахаты. Перамерзнеце, хварэць будзеце, бахуры[2], – маці ўпіхае дзяцей у хату. Крык і піск.



– Унучаткі, рыбачкі мілыя, – загоджваючы справу, адзываецца дзед,– чаго плачаце?

– Жаваранка хочам убачыць!

– Пакажу, жэўжыкі, пакажу, толькі слухайце маткі і сыпце ў хату, акно вам адчыню. Паволі лезьце, дзеці, на лаву, не папіхайцеся. Юзюк! не штурхай Казюка. Пачакай, Марылька, я ця падсаджу. Ну, ціха цяпер, дзеці, слухайце.

– Пяе! Во! – Казюк паднімае ўгару пальчык, – ціры, ціры, ці-і-ір, цір, цір... Ай, як пяе!

Як ад іскры, загараюцца тварыкі дзетак. У дзеда свецяць вочы, моў залатыя дукаты.

– Птуль мой, даўно жданы, – шэпча старавіна, – будзіш народ да працы, звоніш над нашым краем...

– Дзедулёк, во, во – ужо над нашай хатай пяе... чуеш, дзедулёк?

– Чую. Ужо чацвёрты год, як усё той самы да нас прылятае. Але годзе, дзеткі, надта холад верне ў хату, трэ акно зачыніць.

– Яшчэ, яшчэ, дзедулёчак, хочам паслухаць хоць крышку...

---

[1] **Шкулдыкаць** – ісці.

[2] **Бахур –** абласное слова *бутуз*; карапуз.

– Годзе, унукі, годзе: лепш я вам раскажу аб жаваранку, толькі адыдзіце ад акна.

– Але, але! раскажы нам шмат, шмат...

– Гэта, дзеткі, залежыць ад вас: будзеце сядзець ціха – раскажу вам больш, а пачнеце выкручвацца – скажу менш. А цяпер – гыля ад акна!

– Дзядуля, ужо мы ціха седзімо... чакаем...

– Зара, зара, вазьму толькі плашкі, лучыны нашчапаю.

Стары дзед сядае, дзярэ лучыну, а дзеткі, збіўшыся ў кучку, ужо і губкі разінулі.



– Ось, слухайце, унучкі. Жаваранак – невялічкая, як ведаеце, птушачка з чорнымі жвавымі вочкамі, сама шэранькая, зямліста-бурага колеру, дык пёрачкі падыходзяць якраз пад колер зямлі, так што здалёку, калі жаваранак сядзіць на зямлі, то трудна і прыкмеціць, а гэта шмат яго бароніць ад напасці; бо трэба вам ведаць, дзеткі, што жаваранак мае шмат ворагаў, ой, шмат, а найгоршы паміж іх – гэта добра вам знаны... ну, жэўжыкі, каторы з вас першы згадае?

– Сабака!

– У-га! якраз стрэчны брат яго. Адгадвайце яшчэ.

– Воўк! Воўк!

– І не ён.

– Ну то і не ведаем! Хто, дзедулёк, хто?

– О-ёй, унучкі, добра толькі падумайце, я вам памагу: вусаты, на кілбасы ласы, на прыпечак сядзе – мыецца...

– Кот! Кот!

– Так – ён, гад, шмат марнуе жаваранкаў. Цягаецца, шэльма, па полі, а як жаваранак прыкурне на раллі, кот падгледзіць, падкрадзецца: цап-лап, хмурлык – і птушачкі як не было. Дрэнна, што жаваранак аблюбаваў весціся па нізкіх месцах, бо дзеля гэтага яго можа з’есці і крот, і мыш, і лісіца, і шмат іншых звяркоў і звяроў; угары – у лёце – жаваранка ловяць меншыя і большыя каршуны. Хоць і губяць жаваранкаў розныя ворагі, аднак ён не хаваецца: больш, чым жыццё, міла яму свабода, дык жыве на прасторы, пяе людзям на ўцеху, а ворагам на прыманку.

Для гнязда свайго выбірае жаваранак заўсёды ў адной і той самай ваколіцы роўнае, адкрытае месца: сенажаць, папар[1] або жытнюю ніву, выкашкае там сабе ямачку пад каменьчыкам ці грудкай зямліцы, назносіць туды саломінак, сухой траўкі, саўе гняздо, акругліць яго, а каб было аздабней і цяплей у хатцы, то яшчэ высцеліць усярэдзіне конскім валоссем. Віць гняздо жаваранку памагае і жаваранчыха, а як ужо пабудуюць яго, тады яна пачынае несці маленькія зеленаватыя або чырванаватыя з бурымі крапінкамі яечкі. Нанясе іх штук чатыры-пяць і садзіцца на пятнаццаць дзён, але час ад часу падмяняе сядуху сам жаваранак. Як выйдуць дзеткі, крыху падгадаваўшы, вучаць іх бегаць і лётаць, а пасля і пушчаюць у свет. Але пакуль далей расказваць, закуру перш люльку[2], а вы, унучкі, пабегайце тым часам, ножкі папрастуйце.



– Ну, пабрыкалі, і годзе, сядайце, будзем гутарыць далей. Як толькі бацькі-жаваранкі пераканаюцца, што іх дзеткі ўжо розуму набраліся і самі сабе могуць даць рады на свеце, пачынаюць закладваць другую сямейку, падчысцяць, падправяць гнёздачка, самка накладзе туды зноў чатыры-пяць яечак, супольна – па чародцы – грэюць іх, ажно пакуль зноў не пакажуцца голенькія, брыдкія, з вялікімі галоўкамі, сляпыя, мала чаго большыя ад добрай бабіны, дзеткі. Пачынаецца новы клопат: трэба ж кожнае ў пару накарміць, зважаючы, каб аднаму не было многа, другому мала, ды пасцельку даглядаць, каб заўсёды была ў парадку і чыстасці, ды ад ворагаў – колькі змога і сіла – бараніць сваю сямейку, словам, гультаяваць некалі; але ў іх мамка на татку, татка на мамку не здаюцца, каб усё ў парадку было, абаім трэ добра завіхацца, затое і дзеткі хутка і здарава растуць. Праз некалькі тыдняў глядзі – бацькам палягчэнне ўжо ў працы

---

[1] **Папар –** поле, пакінутае на адно лета незасеяным з мэтай паляпшэння глебы пад пасеў азімых.

[2] **Люлька –** прылада для курэння, якая складаецца з цыбука і галоўкі, пустой ўнутры, у якую насыпаюць тытунь.

ёсць: павыскаквае моладзь з гнязда, куды ў каторы бок параспаўзаюцца ды самі сабе ўжо стараюцца харчоў. Спачатку, праўда, туга ідзе праца: угледзеўшы, напрыклад, дзе якую мушку ці кузюрку, здаецца, і добра прырыхтуецца, як мае быць прыцэліцца, носікам – дзюб, – мошка паляцела, а сам паляўнічы ляжыць дагары і ножкамі перабірае. Ну, але гэта байкі – чаго на свеце не бывае, – страпянецца ды зноў за работу.

Падкачаюцца гэтак дзеткі і пайшлі сабе ў свет, а старыя тым часам, калі восень добрая і цёплая, яшчэ справяцца і трэцюю сямейку выгадаваць, абы яды хапала.

– Дзедулёк, а куды ж жаваранкі на зіму адлятаюць?

– За мора, дзеткі, за мора, у цёплы край, дзе зімы няма...

– То і там яны, дзедулёк, гнёздачкі робяць і гадуюць дзетак?

– Не, жэўжыкі мае, не. Голад і холад толькі заганяюць жаваранкаў у тую цёплую, багатую і пекную[1] краіну; але як бы яна ні была пекная, а для жаваранкаў яна сумная, бо чужая. Там яны не толькі не гадуюць дзетак, але нават песенькі сваёй залацістай чужынцам не пяюць, свой галасок, усю сілу яго для нас з вамі, жэўжыкі, пакідаюць, для свайго роднага краю.

Затое паслухайце жаваранка тут: які голас, голас! Проста сляза Божая! Хоць, праўду кажучы, не ўсе яны аднолькава пяюць, – от, не раўнуючы, як у людзей: адзін цягне грубей, другі – цяней.

Ось, напрыклад, жаваранак, што сягоння пеў, – гэта сярэдняй рукі спявака, а той, што на Мацеевых гонях вядзецца, – проста перлы сыпле з-пад сінявы нябеснай. І як толькі яны вытрываць могуць столькі пець, бо трэба ведаць, што жаваранкі спяць толькі гадзіны дзве-тры, а рэшта праз увесь час найбольш песнямі забаўляюцца. Пяюць толькі жаваранкі-самцы, а жаваранчыхі – вядома, гаспадыні – усялякія хатнія клопаты маюць, ім не да таго.

Каб не жаваранкі, нашыя палеткі шмат гінулі б ад усялякага паскудства: нападаюць на наша поле ўсялякія жучкі, мошкі, кузюркі, рабакі[2], але дзе ўжо завядзецца сямейка жаваранкаў, там у блізкасці гэтаму паскудству няма жыцця: выткнуў рабак нос – смерць, прысела мошка на кветачку – капут, жучок узлез колас глуміць – квіт.

---

[1] **Пекны** – прыгожы.

[2] **Рабак** – тут, гусеніца

Апошні раз усё гэта падчысцяць каля сябе жаваранкі, дык пасля прыходзіцца ўжо і дальш лётаць за пажывай. Ну, але як прыцісне холад, тады ўжо рады няма – трэ выбірацца з роднай старонкі...

Слухаючы, як жаваранкі ад світа да змяркання ажно заходзяцца, пеючы свае песні, хто б падумаў, што ім заўсёды добра і вясёла жывецца. Тым часам бывае ўсяк. Апроч бяды ад ворагаў, аб якіх я ўжо спамінаў вам, дзеткі, жаваранкі яшчэ і паміж сабою не заўсёды складна жывуць. Праўда, жаваранак з жаваранчыхай, калі ўжо дабяруцца да пары, то праз усё жыццё сваё разам трымаюцца, і ніколі паміж імі нават сваркі не бывае, але з іншымі – суседзямі – то часам так сварацца, ажно чупрыны курацць. Прычыны да звадкі розныя бываюць, вядома, як у суседстве: то за месца на гняздо, то за яду, а найбольш, калі часам жаваранчыха дзе згіне, а застанецца толькі сам жаваранак. Такому ўдаўцу, разумеецца, жыць сумна – няма куды прытуліцца, вось і стараецца ён усялякімі спосабамі як-колечы прыснасціцца да суседняга гнязда; але гэткай помачы не патрабуюць, гаспадар і гаспадыня няпрошанаму госцю так усыпюць, ажно пёркі ляцяць.

Туляецца гэтакі ўдавец без работы з месца на месца, пакуль не трапіць на жаваранчыху-ўдаву, да каторай з радасцю ідзе ў прымакі...

Ну, але што гэта, бахуры, заўзяліся вы дзед а мучыць, ці што? Цьфу! ажно ў горле перасохла. Што я вам – млын ці дзед? Хоць бы вы жавараначка любілі, але дзе ж вашым гарбузіным галоўкам зразумець такую рэч...



– А я зразумеў, – круцячы галоўкай, пахваляецца Юзюк.

– Што ты, шпунт, зразумеў?

– А тое, што жаваранак вельмі карысная птушачка: яна нам пяе і шкоднікаў нашых ніў паядае.

– Маладзец! За гэта я цябе на печ, Юзюк, закіну.

– Не, не ўздужаеш, дзедулёк, не ўздужаеш, – падхопліваюць грамадой усе дзеці і чапляюцца дзеду на шыю.

– Ну, ну, толькі не ўсе разам, а то ў дзеда галава сухая: адкруціце яе, як даспеўшую макаўку, і ўсе казкі высыплюцца.

# Змітрок Бядуля

## Казка «Скарб»



Ля рэчкі, пад вольхай, хохлік знайшоў ракавінку. Уладзіў у ёй кузню і давай чырвонцы каваць. Праца ў яго заўсёды кіпела ўночы, калі, бадай, усе жывыя істоты спалі, калі спяваў адзін салоўка і месячык рэчку фарбаваў.

У кузні ў хохліка было некалькі памочнікаў. Светлячок раскладваў агонь на горне. Цвыркун працаваў малатком пры кавадле. Жаба дзьмухала кавальскімі мяхамі.



Пад карэннямі вольхі, ля рэчкі, крот выкапаў патаемныя падзямеллі, дзе хохлік хаваў свой багаты скарб – скрыні з золатам. Разнеслася вестка па ўсёй ваколіцы ля рэчкі, што хохлік вельмі багаты і мае незлічоныя скарбы пад вольхай.

– Сама сваімі вушамі чула, – казала маленькая плотачка ў рэчцы, – цэлымі начамі куе ды куе ў сваёй кузні, грукае і стукае і нам, рыбкам, проста спаць не дае.

– Сама сваімі вачыма бачыла, – казала варона, – усё там у яго ў кузні блішчыць і блішчыць. Свеціць як маланка, ажно вочы слепіць мне, старой. І я мусіла сабе купіць цёмныя акуляры, бо доктар драч напужаў мяне, што зусім аслепну пад старасць, калі не буду асцерагацца. Адно гора з гэтым хохлікам.

– Ку-ку! Ку-ку! Раз-два! Тры-чатыры! – кукавала зязюля на вольсе. Яна ў цёплыя раніцы сядзела на дрэве ды ўсё лічыла багацце хохліка. Але зязюля ў лічбах надта не кемная: лічыць-лічыць, заблытаецца ды зноў спачатку пачынае, і гэтак штодня.

– З-з-з-м-м-м! З-з-з-м-м-м! – гудзеў авадзень над рэчкай. – Гэта ж проста бяда, аднаму ўсё, а другому нічога. Я лётаю-лётаю, б’юся як рыба аб лёд і нічагуткі не маю, а хохлік увесь свет захапіў.



– Ш-ш-ш! – казаў чарот. – Не шуміце так, не грыміце ды не зайздросце. Працуйце, дык і вы будзеце мець. Я вось сведка, як хохлік са сваёй сям’ёй працуе да поту.

– Дурань, дурань, дурань! – крыкнуў дзяцел чароту. – Не лезь, куды цябе не просяць. Маўчы, ды годзе. А вось давайце, браткі, будзем дзяліць хохлікава дабро!



– Давайце! Давайце! – крыкнулі вераб’і.

– І мы, і мы да кампаніі! – загудзелі камары.

– Калі ўсім, дык і нам! – закудахталі куры.

Падняўся шум, гармідар[1], крыкі. Наляцелі з усіх бакоў звяры і птушкі, мухі і ўсе жывыя істоты, хто толькі даведаўся аб багацці хохліка. Усе рынуліся да хохліка ў кузню, каб яго абрабаваць.

[1] **Гармідар –** гучная бязладная гаворка наперабой; шум, вэрхал.

Але хохліка таксама ўлегцы не возьмеш. Ён схаваў свае скарбы спрытна. Закопваў па ўсёй ваколіцы ў розных мясцінах – па лясах, па лугах, пад крушнямі, пад дрэвамі. Не было лапінкі зямлі, дзе не ляжалі б яго скарбы. Але ніхто іх знайсці не можа. Грабуцца куры на сметніках. Капаюцца птушкі на палях. Порацца звяр'ё пад карчамі, рыба ў вадзе. Шукаюць, шукаюць, але нічога з гэтага не выходзіць.



Наслухаўся малы Саўка ад свайго старога дзеда, каторы жыў у млыне ля рэчкі, шмат баек аб багатых скарбах. Яны захаваны ў зямлі, іх усе шукаюць пад карчамі і знайсці не могуць.

– Іх трэба шукаць апоўначы ў купальскую ноч, калі кветка папараці цвіце, – казаў дзед, – тады можна іх знайсці.

Вось у купальскую ноч, калі Дзед ужо спаў, малы Саўка выйшаў ціхенька з хаты. Узяў з сабою рыдлёўку і пабрыў скарбаў шукаць. Убачыў ён здалёку агеньчык, які блішчаў на полі ля крушні і вабіў да сябе.



«Гэта, пэўна, скарб!» – падумаў Саўка і пайшоў на гэты агонь. Ён да агню, а агонь ад яго далей і далей, і завёў агонь хлопчыка ў самы цёмны гушчар. Страшна і жудасна было ў гушчары. Дрэвы, як жывыя істоты, шапталіся паміж сабою і нібы дзівіліся, што такі малы хлопчык не баіцца адзін швэндацца ў лесе па начах. Тым часам агонь знік, а замест агню залаты пеўнічак заблішчаў на карчы.

– Вось дзе скарб! – узрадаваўся Саўка і трах рыдлёўкай пеўнічка па галаве. Пеўнічак запяяў і знік, а замест пеўнічка паказаўся залаты зайчык. Саўка зрабіў тое самае з зайчыкам. Паказалася залатая лісічка... Затым – залаты ваўчок... Залаты мядзведзь... Але ён дзіка раўнуў і глынуў Саўку.

Ачухаўся Саўка праз некалькі хвілін. Ажно стаіць ён пад зямлёй, а на яго глядзіць і ўсміхаецца хохлік, малюсенькі і тоненькі, як травінка, прыбраны ў шоўк і ядвабу[1]. На галоўцы ў яго залатая карона з дарагімі каменнямі.



– Вось ты і папаўся, Саўка, у мае рукі! – сказаў хохлік.

– А я ж цябе не баюся, – загарачыўся Саўка. – Зачэпіш мяне, дык я цябе вось адным пальцам задушу! – і паказвае хохліку свой палец. Але як глянуў сам на свой палец, дык адразу анямеў ад страху: палец цянюткі, як павуцінка. Тады давай Саўка аглядаць усяго сябе. Ажно ён сам такі ж маленькі, як хохлік. Тут Саўка спужаўся і заплакаў.

– Не плач,– сказаў хохлік.– Давай цяпер, калі ты ростам такі, як я, будзем аглядаць мае скарбы пад зямлёю.

– На волю хачу, да дзеда! – яшчэ галасней заплакаў Саўка, бо ў яго ўжо адпала ахвота скарбы глядзець.

– Вось табе і адважны, – пачаў кпіць з яго хохлік, – звяроў не баяўся, а цяпер плачаш. Сорам, а яшчэ такі хлопец! Глянь, Саўка, налева і дзівіся!

[1] **Ядваб –** шоўк.

Як глянуў Саўка налева, дык адразу плакаць перастаў, бо сярэбраныя палацы замігацелі пад зямлёй. Увёў хохлік Саўку ў палацы. Як заблішчалі залатыя сцены і дарагія камені на сталах, дык Саўка аж засмяяўся з радасці і забыўся аб усім на свеце.

– Гэта мае палацы, – тлумачыў яму хохлік. – Я тут жыву з усёй маёй вялікай грамадой. Мы ўсе вельмі багатыя. Мая грамада разышлася па ўсіх кутках зямлі на працу. Кожны хохлік мае багатыя скарбы – куе і куе золата і дае багацце таму з людзей, хто шчыра працуе. Матка-зямля мае шмат багацця. Яна шчодрая да тых, хто любіць працаваць. Без мазалёў і поту ніякіх скарбаў не знойдзеш.



Раптам пачуўся шум пад зямлёй. З усіх бакоў, з усіх шчылін пачалі сыпацца хохлікі, як залатыя сняжынкі, як брыльянтавы мак, як жывы каляровы дождж. Малюсенькія-малюсенькія, драбнюткія-драбнюткія і многа-многа, ажно ў вачах мігацела, гледзячы на іх. А ўсе, відаць, працаўнікі заядлыя, майстры адукаваныя: хто з сякерай, хто з рыдлёўкай, хто з малатком, хто з мяшочкам за плячыма, а хто з такім дзіўным інструментам, што Саўка і не ведаў, што гэта.

– Гэта мая сямейка на вячэру прыйшла... Гэй, ты! – паклікаў хохлік аднаго з кампаніі. – Як расце поле таго ратая, што раней за ўсіх у вёсцы на шнур свой выходзіць?

– Вельмі добра расце... Я сам даглядаю жытнія зярняткі, кармлю іх зямельным сокам і паю расіцай.

– А ты што сягоння зрабіў? – строга крыкнуў ён другому.

– Я глядзеў за тым, каб сад добра расцвітаў, каб вецер без пары кветак не зрываў.

– Ну, глядзі, бо гаспадар дзень і ноч у садзе капаўся, трэба, каб яблыкі былі, як гарбузы, а грушы – як кулакі.

– А ты, жэўжык, што рабіў? – звярнуўся ён да трэцяга.

– Я пільнаваў агарод з агуркамі. Лічыў і лічыў, бо трэба, каб сёлета было шмат агуркоў.– І хохлік пачаў лічыць па пальцах. – Пяць коп гаспадару; шчаўцу, што яму боты шыў, – тры капы; кавалю за рыдлёўку – тры капы; хлопчыку, які ваду цягаў, тры...

– Ах ты такі і сякі! – зазлаваўся стары хохлік. – Чаму ты гэтакі скупы? Глядзі, каб усім было не меней як па дзесяць коп!

– Буду старацца, – пужліва сказаў працаўнік.

Падышоў новы хохлік з кнігай і пачаў чытаць аб тым, як хлопчыкі ў школах вучацца, хто стараецца і хто толькі мух ловіць. Доўга чытаў ён аб гэтым, пералічваючы ўсіх сяброў і знаёмых Саўкі.

– Рыхтаваць старанным хлопчыкам самыя найлепшыя гасцінцы, а гультаям і абібокам нічога не даваць! – загадаў старшы хохлік.

Пасля розных распытванняў працавітыя хохлікі селі вячэраць. Чаго-чаго там ні было на вячэру: самыя найлепшыя прысмакі, якія толькі ёсць на зямлі. Саўку, як госцю, вядомая рэч, пападаліся найсмачнейшыя кавалкі.



Павячэраўшы сытна, Саўка заснуў і не паспеў азірнуцца, як апынуўся на ложку сваім у дзедавай хаце.

З таго часу болей Саўка не шукаў скарбаў, бо ведаў, што матка-зямля мае іх у сабе вельмі шмат, але дае толькі тым, хто працуе.

І Саўка ўзяўся за навуку, каб навучыцца працаваць.

# Алесь Гарун

## «Добрыя дзеці»

(са зборніка «Матчын дар»)



Паставілі дзеці сіло[1]. Вераб'я
Хацелі злавіць на пацеху[2],
Злавілі сініцу, крычаць: – Войяя!
А радасці колькі, а смеху!
Імчацца да маці: – Сінічка, глядзі!
– А дзе ж вы ўзялі? – Злавілі,
Дастань ты ёй клетку, хутчэй пасадзі.
– Нядобра вы, дзеткі, зрабілі!
– Мы будзем яе і паіць і карміць,
Спявала б нам птушка прыгожа.
– Ах, дзеткі! У няволі яна замаўчыць,
Спяваць у няволі не можа...
Успомніце толькі, як нудна сядзець,
Як з хаты мароз не пушчае.
То ж дзень, вам здаецца, як тыдзень ідзець,
Хоць я і ўсяк разважаю.
А птушку вы хочаце з хаткі яе
Ўзяць, пасадзіць у чужую...
Не мучце, пусціце, рыбулькі мае,
На волю яе залатую.
І матчыны словы ў сэрцах дзяцей
Ласкáвыя струны кранулі,
І добрыя дзеці – пры́клад для людзей! –
Сініцы свабоду вярнулі.

---

[1] **Сіло́** — прыстасаванне ў выглядзе петляў для лоўлі птушак і дробных жывёл.
[2] **На паце́ху** — для забавы.

# Купальскія песні

***

Ой, на Купалу, на Яна
Іграе сонца, іграе.
Малойчык каня сядлае
Яго мамачка пытае:
– Куды поедзеш, сыночак?
– Што табе, мамка, да таго,
Сядлаю каня не твайго.
Паеду да цесця свайго
А цесця дома ня было,
А цешча пашна ня выйшла,
А дзеўка мала ня знала,
З рукі сегнэтку ня зьняла.
Ой, на Купалу, на Яна
Іграе сонца, іграе.



***

Сёньня ў нас Купала
То-то-то
Ня дзеўка агонь клала,
Сам Бог агонь раскладаў,
Ўсіх сьвятых да сябе зваў
Звала Купала Іллю:
– Ты прыйдзі ка мне Ілля,
Ты прыдзі да Купалля.
– Няма часу, Купала,
Гэту ночку мне ня спаць,
Трэба жыта пільнаваць,
Каб зьмяя не ламала,
Карэнне не капала.



***

Купалінка, Купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка,
Дзе ж твая дочка?
Мая дочка у садочку,
Ружу, ружу поліць.
Ружу, ружу поліць,
Белы ручкі коліць.

Кветачкі рвець,
Кветачкі рвець –
Вяночкі звівае.

Вяночкі звівае,
Слёзкі пралівае.



***

Іван, Іванове,
Ня стой над ракою,
Не машы рукою.
Скокні з моста ў рэчку,
Скокні, акуніся,
Вылезь – апраніся,
Іван, Іванове.



***

Пойдзем, пойдзем лугам,
Лугам зялёненькім.
А у лузе цвітуць цвяточкі,
Там дзяўчаты водзяць таночкі.

Многа песень спета
Пра цёплае лета.
Толькі Ганначка не спявае,
У буйных травах кветкі збірае.



Кветкі збірае,
У вяночак уплятае:
– Пакацісь, вяночак, у дварочак,
Дзе жыве мой мілы дружочак.

Хай ён знае, знае,
Хто яго чакае,
Хай вячэрняй роснай парою
У луг зялёны прыйдзе за мною.

***

Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана,
Проці Йвана ночка мала.
Ой, рана на Йвана.



Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана –
Дзе Купала начавала?
Ой, рана на Йвана.

Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана –
Начавала ў чыстым полі.
Ой, рана на Йвана.

Ой, рана на Йвана,
Ой, рана на Йвана –
У чыстым полі, у густым жыце.
Ой, рана на Йвана.

# Масленічныя песні

***

А мы Масленку дажыдалі,
Люлі-люлі дажыдалі.
Сыра с маслецом праблюдалі,
Люлі-люлі праблюдалі.
Ды на горачку вынасілі,
Люлі-люлі вынасілі.
Сырам горачку усыпалі,
Люлі-люлі усыпалі.
Маслам горачку палівалі,
Люлі-люлі палівалі.
А ты, горачка, будь катліва,
Люлі-люлі будь катліва.
А свякровушка варкатліва,
Люлі-люлі варкатліва.
Ўсю нядзелюшку варкутала,
Люлі-люлі варкутала.
На горачку не пускала,
Люлі-люлі не пускала.
А нам дома не сідзіцца,
Люлі-люлі не сідзіцца.
Ахота з горачкі пракатіцца,
Люлі-люлі пракаціцца.
А на горачке сняжкі пышуць,
Люлі-люлі сняжкі пышуць.
А нас мамухны дамой клічуць,
Люлі-люлі дамой клічуць.



***

Як на Маслянай нядзелі
Мы бліночкаў захацелі,
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Наварылі, напяклі,
Павязлі мы прадаваць,
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Ніхто бліноў не купляець,
Ніхто бліноў не бярэць,
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
А сабака надышла,
Панюхала і проч пайшла,
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Свіння лыч замарала,
Тры нядзелі прахварала,
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.



За ракой агонь патух,
А ў свінні жывот распух.
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.
Ой, бліны мае бліны,
Бліны масляныя.

# Беларускія народныя казкі

## Казка «Жаронцы»



Жылі дзед ды баба. Нічога ў іх з гаспадаркі не было – толькі пеўнік і жаронцы.

Дзіўныя гэта былі жаронцы: паложыць у іх дзед зярнятка, пакруціць раз-другі, і цэлая кадушка мукі намелецца.

Добра жылі дзед з бабай самі і пеўніка не крыўдзілі. Дачуўся пра дзіўныя жаронцы пан. Парашыў ён украсці іх. Прыехаў адвячоркам да дзеда і просіцца пераначаваць. «На паляванні, – кажа, – быў: далёка дадому ехаць, а тут ноч надыходзіць...»

– Начуй сабе, – кажа дзед, – месца хопіць.



Уночы, як дзед і баба заснулі, пан украў жаронцы ды паехаў. Моцна затужылі дзед з бабай па жаронцах. Сядзяць яны галодныя ды плачуць.

Пеўнік слухаў, слухаў іх, а потым і кажа:

– Не плачце, я вярну вам жаронцы!

– Дзе табе вярнуць іх! – кажуць дзед і баба. – Пан цябе і на парог не пусціць.

– Нічога, – падхрабрыўся пеўнік, – вярну. Хоць сам загіну, а жаронцы вярну.

Развітаўся ён з дзедам і бабай ды паляцеў у панскі двор. Ляціць ён дарогаю, ляціць ён шырокаю, а насустрач яму каршун.

– Куды, певень, ляціш? – пытаецца.

– У двор да пана.

– Чаго?

– Пан у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Я лячу іх сыскаць.

– Вазьмі і мяне з сабою.

– Лезь у валляк[1]!

Каршун улез пеўніку ў валляк. Пеўнік паляцеў далей. Ляціць ён дарогаю, ляціць шырокаю, а насустрач яму лісіца:

– Куды, певень, ляціш?

– У двор да пана.

– Чаго?

– Пан у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Лячу іх сыскаць.

– Вазьмі і мяне з сабою.

– Лезь у валляк.

Лісіца ўлезла пеўніку ў валляк. Пеўнік паляцеў далей. Ляціць ён дарогаю, ляціць шырокаю, а насустрач яму барсук:

– Куды, певень, ляціш?

– У двор да пана.

– Чаго?

– Пан у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Лячу іх сыскаць.

– Вазьмі і мяне з сабою.

– Лезь у валляк.

Барсук улез пеўніку ў валляк. Пеўнік паляцеў далей. Ляціць ён дарогаю, ляціць шырокаю, а насустрач яму воўк:



– Куды, певень, ляціш?

– У двор да пана.

– Чаго?

– Пан у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Лячу іх сыскаць.

– Вазьмі і мяне з сабою.

---

[1] **Валляк –** адвіслыя складкі падбародка.

– Лезь у валляк!



Ляцеў, ляцеў пеўнік і прыляцеў у двор да пана. А ў пана ў гэты час былі госці – пілі, гулялі. Вокны і дзверы насцеж парасчынялі. Узляцеў пеўнік на падаконнік, залопаў крыллямі ды заспяваў на ўвесь голас:

– Ку-ка-рэ-ку! Каб пан не дажыў веку! Ён у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў. Я прыляцеў жаронцы сыскаць. Аддавай, пан, жаронцы.

Пану стала брыдка перад гасцямі, што пеўнік яго злодзеем абзывае. Вось ён і кажа:

– Слугі, слугі, схапіце гэтага крыкуна, укіньце ў куратнік: няхай яго куры задзяўбуць!

Схапілі слугі пеўніка, укінулі ў куратнік, а самі пайшлі. Тут пеўнік і кажа:

– Каршун, каршун, вылазь з валляка, падушы курэй.

Выскачыў каршун з валляка, перадушыў усіх курэй ды паляцеў у лес. Пеўнік зноў прыляцеў на падаконнік:

– Ку-ка-рэ-ку! Каб пан не дажыў веку! Ён у дзеда з бабай начаваў ды жаронцы ўкраў…

– Ах, – кажа пан, – дык яго куры не задзяўблі? Добра ж! Слугі, слугі, схапіце гэтага крыкуна, занясіце ў гусятнік, няхай яго гусі зашчыплюць!

Схапілі слугі пеўніка і ўкінулі ў гусятнік.

Пеўнік ачухаўся ды кажа:

– Лісічка, лісічка, вылазь з валляка, падушы гусей.

Лісіца так і зрабіла, а сама ў лес пабегла. Паляцеў пеўнік на падаконнік ды зноў сваё спявае:

– Ку-ка-рэ-ку! Каб пан не дажыў веку!..

– Ах, – кажа пан, – дык яго і гусі не зашчыпалі? Добра ж! Слугі, слугі, нясіце яго ў свінарнік: няхай яго свінні загрызуць.

Занеслі слугі пеўніка ў свінарнік. А там пеўнік кажа:

– Барсук, барсук, вылазь з валляка, пагрызі свіней.

Барсук так і зрабіў, а сам пабег у лес. Прыляцеў пеўнік на падаконнік. «Ку-ка-рэ-ку!..»

– Ах, – кажа пан, пачуўшы пеўнікаў голас, – дык яго і свінні не загрызлі?.. Слугі, слугі, укіньце яго ў стайню: няхай яго коні затопчуць.

У стайні пеўнік кажа:

– Воўк, воўк, вылазь з валляка, парэж коней. Воўк выскачыў, парэзаў усіх коней і ходу ў лес.



Прыляцеў пеўнік на падаконнік:

– Ку-ка-рэ-ку!..

Пан аж за галаву хапіўся: што ж рабіць? Потым кажа:

– Слугі, слугі, схапіце гэтага крыкуна, занясіце кухару, няхай ён яго засмажыць.

Слугі так і зрабілі. Кухар засмажыў пеўніка і прынёс на талерцы пану. Пан схапіў яго ды і праглынуў са злосці ўсяго адразу. А пеўнік ажыў у панскім жываце, вытыркнуў дзюбу праз правае вуха ды заспяваў:

– Ку-ка-рэ-ку! Каб пан не дажыў веку!..

Пан закрычаў:

– Слугі, слугі, хапайце сякеры, сячыце гэтага нягодніка!

Схапілі слугі сякеры, як секанулі, дык і адсеклі пану правае вуха… А пеўнік пералез у левае вуха ды зноў заспяваў.

– Слугі, слугі, – крычыць пан, – сячыце яго!

Секанулі слугі, ды не па пеўніку, і адсеклі пану левае вуха. Застаўся пан без вушэй. Тады пеўнік высунуўся праз рот.

– Слугі, слугі, – крычыць пан, разявіўшы рот, – сячыце, сячыце яго!

Секанулі слугі, ды не па пеўніку, а па языку, – адсеклі пану язык.

А пеўнік выскачыў, паляцеў на падаконнік, сеў і спявае. Бачыць пан – няма рады: усю яго жывёлу пеўнік перадушыў, ды і самога скалечыў.

Вынес ён жаронцы з пакояў і аддаў іх пеўніку. Пеўнік схапіў адзін камень пад адно крыло, другі – пад другое і паляцеў дахаты.



Зарадаваліся дзед з бабай жаронцам, пачалі ў іх муку малоць. З мукі хлеб пякуць, самі ядуць і пеўніку даюць.

# *Казка «Людзей слухай, а свой розум май»*



Быў адзін дурнаваты чалавек. Захацелася яму пайсці на кірмаш. Злавіў ён белага пеўня, засунуў за пазуху ды пайшоў. «Прадам, – думае, – пеўня, куплю махоркі».

Яшчэ не дайшоў да кірмашу, а тут ужо яго і купцы сустракаюць:

– Што прадаеш, дзядзька?

– Пеўня, – кажа чалавек.

Дастаў ён з-за пазухі белага пеўня. Купцы паглядзелі, галовамі паківалі:



– Які ж гэта певень? Гэта ж заяц!

«Жартуюць, – думае дзядзька, – ліха ім!» Забраў пеўня ды ідзе далей.

Прайшоў крыху – другія купцы падбягаюць:

– Што прадаеш?

– Пеўня.

Паглядзелі:

– Які ж гэта певень? Гэта ж заяц!

Прыгледзеўся лепш чалавек і сам да свайго пеўня: «А можа, і заяц? – думае. – Не вер вачам! Відаць, праўда, калі ўсе як у бубен б’юць».

Прыйшоў ён на самы кірмаш. Людзей там так густа, што і яблыку няма дзе ўпасці.

Каля аднае крамы стукаюць у патэльні, каля другой звоняць косамі – пакупнікоў заклікаюць. Такі шум, гоман на кірмашы, што чалавек ледзь не аглух.



Ачухаўся ён трохі і сам пачаў крычаць:

– Купіце зайца! Купіце зайца!

Падыходзіць да яго баба, дзівіцца:

– Які ж гэта заяц? Гэта ж певень!

Ды чалавек стаіць на сваім:

– Заяц, кажу табе, а не певень!

Сабралася куча народу. Жартуюць з бабы:

– Дзядзька праўду кажа! Ці ж ты не бачыш, што гэта заяц!

Тут ужо чалавек зусім паверыў, што прынёс ён на кірмаш зайца, а не пеўня. І калі хто з купцоў гаварыў цяпер, што гэта певень, а не заяц, дык ён ледзь не з кулакамі на яго кідаўся.

Хадзіў, хадзіў чалавек па кірмашы з пеўнем, і ўсё яму здавалася, што гэта не певень, а заяц.



Надакучыла пеўню цягацца з чалавекам – пара б ужо і на седала збірацца! Залопаў ён крыламі ды як закрычыць на ўвесь кірмаш:

– Ку-ка-рэ-ку!

Пачуўшы гэта, чалавек зусім збіўся з панталыку: заяц, а пеўнем спявае! Выкінуў ён пеўня з-за пазухі, плюнуў ды пайшоў дахаты.

Праўду кажуць старыя людзі: не той дурань, каго завуць дурнем, а той дурань, хто чужым розумам жыве.

Людзей слухай, а свой розум май.

# *Казка «Стралец і рыбак»*



Былі ў бацькі два сыны. Выраслі яны, як дубы, а бацьку ўсё няма палёгкі.

Большы, праўда, старанны быў хлопец, ды вось бяда: змалку ўсё розныя пасткі майстраваў, а як падрос, дык дастаў сабе стрэльбу і не разлучаецца з ёю. Людзі на работу ідуць, а ён стрэльбу на плячо ды шмыг у лес ці на балота. Цягаецца ўвесь дзень, дахаты ж з пустымі рукамі ідзе, галодны як воўк. Топча лапці, а прыбытку ніякага. Калі ж часам і ўпалюе якое зайчаня, дык хутчэй нясе пану, каб той даў пораху.



Перш сварыўся на яго бацька, потым бачыць – нічога не парадзіш, калі ў сына такая ахвота.

А меншы сын такі гультай удаўся, што хоць ты яго з хаты гані. Дзень і ноч сядзіць з вудаю на рэчцы, за гаспадарку ж ані не бярэцца. Наловіць жменю печкуроў ці яршоў – якая ад іх карысць? Кату паласавацца.

Пачаў і на яго бацька сварыцца, што толькі час марна траціць. Але і меншы сын не слухае бацькі, бо, вядома, ахвота горш няволі.

А каб апраўдацца перад бацькам, што з пустымі рукамі прыходзяць, выдумляюць сыны розныя прычыны.

Стралец расказвае:

– Сёння з самага ранку натрапіў я на чараду коз. Была там каза з казлянятамі ды стары казёл барадаты. Але толькі я злажыўся, каб стрэліць, ажно ў казла, ліха на яго, у ноздрах восы заказыталі. Ён як

чмыхнуў, дык цэлы рой восаў вылецеў з ноздраў. Давай тыя восы казу з казлянятамі кусаць… Ну, яны і пасмалілі, як шалёныя, у гушчар. Я за імі. Выскачыў на палянку, а там стаіць на задніх лапах вялізны, як вол, мядзведзь. Чмыхае мядзведзь носам ды абараняецца пярэднімі лапамі ад чмялёў. Ну, думаю, гэта, відаць, толькі што выйшаў з яго чмяліны рой. У такі час мядзведзі вельмі злосныя. Пабаяўся я страляць у яго, а хутчэй скокнуў на елку. Дык вось і сядзеў там, на елцы, увесь дзень, пакуль мядзведзь не пайшоў…

Рыбак расказвае:

– Сяджу гэта я на беразе, цікую за паплаўком. Раптам нейкі шчупачышча цоп за кручок – і на дно! Я за вудзільна, цягну, ажно жылы ў мяне трашчаць. Давалок да берага, а шчупак віль хвастом – і будзь здароў… Бадай цябе! Закінуў другі раз вуду. Зноў той шчупачышча-дурнішча папаўся. Падцягнуў яго да берага, хацеў рукамі ўхапіць, ды не ўтрымаўся і – шабулдых у ваду!.. Насілу жывы выкарабкаўся.



Слухае іх бацька і толькі галавою ківае:

– Праўду бо людзі кажуць, што ў стральца дым густы, ды абед пусты, а рыбак як намочыцца, дык і рыбы яму не захочацца.

Думаў, думаў бацька, як яму адвучыць сыноў ад благой прывычкі, ды нічога не можа прыдумаць.

Аднойчы зайшоў да яго стары жабрак і папрасіўся нанач. Разгаварыўся бацька з жабраком, на сыноў паскардзіўся.

– Выгадаваў, – кажа, – дзяцей, а падмогі на старасць ніякай. Бо вядома: стралец страляе, а гаспадарка гуляе!

Выслухаў жабрак бацькаву скаргу і параіў, што яму зрабіць, каб прывучыць сыноў да гаспадаркі. Назаўтра бацька кажа сынам:

– Вось што, сынкі, ёсць у мяне адна далёкая радня. Пайду я да яе. А вы сабе жывіце, як хочаце.



Сабраўся і пайшоў.

Засталіся сыны гаспадарамі. Доўга яны гаспадарылі ці нядоўга, але хутка дажыліся так, што няма чаго, як кажуць, і на зуб палажыць. Пачалі браты спрачацца, хто вінаваты. Спрачаліся, спрачаліся, а праўды так і не дайшлі.

Толькі вось праз нейкі час зноў завітаў да іх той жабрак. Ну, вядома, трэба накарміць чалавека, а ў братоў ні кавалка хлеба.

Стралец дакарае рыбака:

– Няхай бы ты хоць якую рыбіну злавіў, каб было чым чужога чалавека прыняць.



Рыбак адказвае стральцу:

– Няхай бы ты хоць якое казляня падстрэліў… Паслухаў іх жабрак і кажа:

– Дзякую вам, хлопчыкі, за клопат. Ёсць у мяне хлеб, што добрыя людзі далі.

Дастаў ён з торбы хлеб, сала і пачаў частаваць стральца і рыбака. Сорамна ім прымаць пачастунак ад беднага жабрака, ды голад не цётка.

Накінуліся браты на жабракову торбу і як бачыш усю апрасталі.

– Чаму вы такія бедныя? – пытаецца ў іх жабрак. – Хіба ў вас няшчасце, якое, ці што?



Браты цяжка ўздыхнулі:

– Зусім, дзядуля, прапала наша гаспадарка…

– А як жа вы раней жылі?

– Бацька гаспадарыў, дык хлеб і вёўся.

– А што ваш бацька: малады ці стары?

– Ды зусім ужо стары.

– Вось бачыце, – кажа жабрак, – ён стары ды гаспадаркаю карміўся сам і вас карміў. А вы маладыя, дужыя і без хлеба галееце…

Брыдка стала братам, радзей пачалі яны са стрэльбай ды вудай цягацца, а больш гаспадаркай займацца.



Мінуў год-другі, і зажылі яны як трэба.

Тым часам вярнуўся бацька з гасцей. Паглядзеў: гаспадарка як мае быць!

Зарадаваўся ён і кажа да сыноў:

– Вось цяпер я магу спакойна і паміраць, бо бачу, што вы розуму набраліся: ловіце, страляеце і гаспадарку даглядаеце.

# Казка «Каток – залаты лабок»



Жылі дзед з бабай. Былі яны вельмі бедныя: ні насіць няма чаго, ні варыць. Вось баба і кажа дзеду:

– Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, ссячы дубок, завязі на рынак, прадай і купі гарчык мукі. Спячом хлеб.

Сабраўся дзед, паехаў у лясок, пачаў секчы дубок. Выскачыў з дуба каток – залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

– Дзед, дзед, што табе трэба?



– Ды вось, каточак, мой галубочак, паслала мяне баба ссекчы дубок, завезці на рынак, прадаць і купіць гарчык мукі на хлеб.

– Едзь, дзед, дахаты: будзе ў вас мука!

Прыехаў дзед дахаты, ажно ў яго мукі поўныя засекі.

Спякла баба хлеб, сама наелася, дзеда накарміла і кажа яму:

– Не шкодзіла б цяпер і заціркі[1] наварыць. Ды солі няма. Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток – залаты лабок: папрасі ў яго солі.

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток – залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

– Дзед, дзед, што табе трэба?

– Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць – солі няма!

– Едзь, дзед, дахаты: будзе соль!

Прыехаў дзед дахаты, ажно ў яго солі цэлая дзежка стаіць.

[1] **Зацірка –** рэдкая страва з дробных мучных камячкоў, згатаваных на вадзе або малацэ.

Наварыла баба заціркі, сама наелася, дзеда накарміла ды кажа яму:

– Не шкодзіла б цяпер і капусты паспытаць. Вастры, дзеду, тапарок, едзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток – залаты лабок: папрасі ў яго капусты.

Навастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток – залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

– Дзед, дзед, што табе трэба?

– Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць, соль ёсць – капусты няма!

– Едзь, дзед, дахаты: будзе капуста!

Прыехаў дзед дахаты, а ў яго капусты поўная кадушка!

– Ай, як добра! Вось каб цяпер яшчэ сальца… Мы б з табою капусты наварылі, сальцам закрасілі б. Не палянуйся, дзеду: вазьмі тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток – залаты лабок: папрасі ў яго сальца.

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток – залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

– Дзед, дзед, што табе трэба?



– Ды вось, каточак, мой галубочак: просіць баба яшчэ сальца да капусты.

– Добра, дзед, едзь дахаты: будзе сала.

Прыязджае дзед дахаты, а ў яго сала цэлы кубелец!

Рады дзед, рада баба. Сталі яны жыць ды пажываць, дзецям казкі казаць.

І цяпер жывуць, хлеб жуюць, капустаю з салам закусваюць.

Вось вам казка, а мне абаранкаў вязка.

# Легенды

## Адкуль пайшлі беларусы

Калісьці яшчэ свет толькі зачынаўся, дык нічога нідзе не было. Усюды стаяла мёртвая вада, а пасярод вады тырчэў нібы камень. Адзін раз пярун разыграўся і давай пыляць стрэламі ў гэты камень. Ад яго стрэлаў выскачылі тры іскаркі: белая, жоўтая і чырвоная. Упалі тыя іскаркі на ваду; з гэтага ўся вада скаламуцілася, і свет памуціўся, як хмары. Але па некаторым часе, як усё праяснілася, дык і адзначылася – дзе вада, дзе зямля. А яшчэ па некаторым часе завялося ўсякае жыццё ў вадзе і на зямлі. І лясы, і травы, і звяры, і рыбы, а пасля і чалавек завёўся: ці ён прыйшоў аднекуль, ці вырас хутка.

Гэты жыхар стаў заводзіць свае чалавечыя парадкі. Ці доўга ён так жыў, ці мала, але меў ён ужо сваю сялібу і шмат дзяцей. Было яму прозвішча Бай. А як прыйшла яго гадзіна смерці, дык ён склікаў сваіх сыноў і падзяліў сваю маёмасць. Толькі аднаго сына забыў.

Той у гэты час быў на паляванні, і з ім былі любімыя бацькавы сабакі Стаўры і Гаўры. Прозвішча гэтаму сыну было Белаполь.

Неўзабаве пасля смерці бацькі вярнуўся Белаполь з палешні[1]. А браты яму кажуць:

– Вось бацька падзяліў нам усю сваю маёмасць, а табе ён адказаў сваіх сабак, дык яшчэ наказаў, каб ты іх пусціў па волі: аднаго – у правы бок, а другога – у левы; колькі яны зямлі аббягуць у дзень, дык гэтая ўся зямля твая будзе.

Вось пайшоў Белаполь і злавіў дзвюх птушак, прыляцеўшых адну з паўднёвага мора, другую з заходняга. Пусціў адну птушку на поўдзень, ды і кажа першаму сабаку: «Бяры!»

Пусціў другую на захад і кажа другой: «Хапай!»

[1] **Палешня** – паляванне.

Як паляцелі тыя птушкі: адна ў адзін бок, другая ў другі… Як пабеглі сабакі за птушкамі, дык ажно зямля закурылася… Як пайшлі тыя сабакі, дык і да гэтага часу не вярнуліся, а па іх слядах дзве рэчкі працягнуліся, у адзін бок прайшла Дзвіна, а ў другі бок – Дняпро.

Вось у гэтых абшарах Белаполь і пачаў сяліцца ды заводзіць свае лады…

У гэтага Белаполя ад розных жонак яго развяліся розныя пляменні пад прозвішчам БЕЛАРУСЫ.



# *Адкуль зязюля ўзялася*

Калісь праз вякі, у нашым краі, жыў багаты зямянін,– Властам яго звалі, і меў ён тры дачкі: Мляву, Здану і Зязюлю, як кветкі красныя, ладныя, як птушкі, але кращчая за ўсіх, то Зязюля была. За гэта завідушча Млява проціў Зязюлі зло на вуме мела.

Раз, пад вечар, пасля спякоты, прыбягае Млява да сясцёр і кажа:

– Сястрычкі, кветачкі, пойдзема на возера купацца!

Тыя, вядома, як дзяўчаты,– рады падурэць, кінуліся навыперадкі. Зязюля апярэдзіла ўсіх, бо спраўнейшая была; за ёю і Здана пабегла.

Кінуўшы вопраткі на беразе, паскакалі ў воду і давай пялёскацца, а Млява тым часам спраўне ўвінулася[1]: вопратку Зязюльчыну скраўшы, патапіла ў возера і сама, як бы нічога не ведаючы, палезла купацца.

Купаюцца гэта яны, ажно загрымела – зірк! – бура, навальніца надходзіць.

– Сястрыцы, уцякайма! – крычыць Млява і, не чакаючы другіх, схапіўшы вопратку, духам дамоў. За ёю і Здана паджгала. А Зязюля ходзіць па беразе, рукі ломіць, усё вопраткі шукае, шукае ды глядзіць. А вецер-то свішча, а на неба аж страх глянуць: хмары з рэхатам адна на другую пруцца, барукаюцца[2], варочаюцца, – няйнача як у гаршку. Ходзіць Зязюля, галосячы,– зірк! – з-за куста паніч выходзіць – красен, што крашчага ў свеце не знайсці, і вопратку Зязюльчыну ў руках трымае. Зязюлька хацела ўцякаці, але, глянуўшы яму ў вочы, стала як прыкована і глядзіць, вачэй адвесці не можа; штось да яго цягне, а сэрца як бы чым цёплым аблілося, а яшчэ як загаварыў, дык Зязюля не вытрымала – кінулася яму на шыю. І забраў той закляты княжыч Зязюлю да сябе ў крыштальныя палацы, у возера.

Жывуць яны ў шчасці, што лепшага і не згадаць, год, другі і трэці, а далей – згадала Зязюля бацькоў, і захацелася ёй пераведаць іх, і просіць мужа:

– Саколе мой ясны, пусці мяне дадому збегаць, бацьку ды маці пацешыць!

---

[1] **Увінуцца –** управіцца, паспець.

[2] **Барукацца** – дужацца.



Той хоць нехаця, але дазволіў і кажа:

– Глядзі, Зязюля, не баўся, перад ноччу назад вяртайся, і як прыйдзеш на бераг, то клікні тройчы: «Якуб!» – і выплыве вуж вялізны, а ты не лякайся[1] яго, бо то я буду і забяру цябе!

Прыйшла гэта Зязюля к бацькам, а тыя радыя – не знаюць, як яе прымаці: на кут пасадзіўшы, белым пірагом ды салодкім мёдам трактавалі. А Мляву, гледзячы на тое, яшчэ горш зло бярэ. Як толькі маці з Зязюляю засталіся самі ўдзвюх, стала маці пытаціся, дзе яна жыве, як і з кім, як яго зваці. Тая, бедная, вядома, як матцы, і выказала ўсё, а таго не ведала, што Млява пад дзвярыма ўсё чуе. Прагаварылі так да вечара і не агледзеліся, як стала цямнець.

Тады бачыць Млява, што Зязюля да мужа збіраецца, сама, узяўшы тапор, чым дужа – на бераг і кліча:

– Якуб! Якуб! Якуб!

Ён, небарака, не распазнаўшы голасу, выплыў, а яна як трэсне тапаром яго па галаве, так напалам і рассекла, а сама наўцёкі. Счакаўшы крыху, прыбягае і Зязюля, але, знаць, сэрцам чуе нядолю, бо і губы пабялелі, і ручкі чагось трасуцца, а сэрца аж здалёк чуваць, як калоціцца. Стала на беразе і кліча:

– Якуб! Якуб! Якуб!

І жаласць бярэ яе вялікая... З той вялікай жаласці зрабілася яна птушачкай, і ляціць Зязюля на вярбу, з вярбы ў лес, і так з дрэва на дрэва ляціць і кліча:

– Якуб! Якуб! Якуб!

---

[1] **Лякацца –** палохацца, пужацца.

# Адкуль узяўся мядзведзь

Ці ведаеце вы, адкуль узяўся мядзведзь?

Мядзведзь перш быў такі самы мужык, як і ўсе мы, гарапашнікі[1].

Даўно тое здарылася. Людзей тады было мала. Гэта цяпер так народу намножылася, што ледзь зямля іх падымае. А даўней людзі жылі сям-там па лесе, лавілі звера, птушак, а ў азёрах ды рэках – рыбу. Улетку збіралі ягады або капалі карэнне, рабілі запасы на зіму. Больш за ўсё запасалі арэхаў і мёду. Пчол тады было багата. Яны самі вадзіліся ў дуплах і ў земляных норах. Па лесе і цяпер яшчэ ёсць пчолы ў дуплах. Дык вось людзі і шукалі такіх пчол, і хто першы знаходзіў, таго і былі тыя пчолы. Ён абвязваў дрэва, на якім вяліся пчолы, лічылася, што гэтыя пчолы ягоныя, а таму ніхто не мог іх чапаць.

Але жыў сярод людзей адзін гультаяваты мужык. Яму не хацелася самому шукаць пчол, дык ён прымудрыўся выдзіраць чужыя. Толькі цяжка яму было ўзлазіць на дрэва. І пачаў ён шукаць ведзьмара.

За сямю лясамі ды за сямю балатамі меўся такі вядзьмар. Вось і пайшоў гультаяваты мужык да яго. Ідзе ён ды ідзе лясамі, бачыць – ліпа абвязана; думае – пчолы. Падышоў бліжэй, зірнуў, аж дупло зусім нізка, а ў дупле – мёд. Выдраў гультай пчол і пайшоў далей. Бачыць – другое дрэва абвязана. Выдраў ён і тут пчол. Сыты і задаволены, падыходзіць гультаяваты мужык да вядзьмаравае зямлянкі.

Таго якраз не здарылася дома. Глядзіць мужык, аж тут пры самай зямлянцы ў дрэве пчолы. Давай гэта ён і тых пчол выдзіраць.



Але тут вядзьмар з’явіўся. Зірнуў на чужога чалавека і кажа:

– Раз пага́ліўся[2] на чужое, дык з гэтае пары і ты, і твае дзеці, і ўсё тваё кодла[3] будзеце толькі пчол драць!

Абярнуў вядзьмар таго гультаяватага мужыка ў мядзведзя.

Дык вось адкуль узяўся мядзведзь.

---

[1] **Гарапашнік –** бядняк, гаротнік.

[2] **Пагаліцца –** паквапіцца, пажадаць займець, захапіць.

[3] **Кодла** – сям’я, род.

# Паданні

## Добры Жыцень

Пры суседнім сяле, пад старою вярбою, здавён жыў Жыцень. Дзядок такі. З доўгай барадою. Трошкі на мяне, Лесавічка, падобны.

Як пойдзе сонейка на спачын і ноч апусціцца, Жыцень выходзіў са свае схованкі ды на поле бег. Дзе – каласок падыме, ад пылу атрасе, дзе – каліўца паправіць, каб лепей расло. Не раз і палівачку з сабою браў, ішоў да крыніцы і палеткі ратаваў ад спёкі.

Радаваліся людзі: зямелька радзіла, жыта ўмалотным было. Ды аднойчы ў сяло прывалокся Злыдзень. Убачыў, што ў людзей на палях усё добра, паклікаў Жыценя і кажа:

– Не тым займаешся! Жыта і само вырасце. Ты лепей песні пра мяне спявай. Інакш згубу на цябе напушчу.

Але Жыцень не спалохаўся. Як хадзіў на палі, так і працягваў хадзіць, збажыну па-ранейшаму даглядаць.

Дачуўся Злыдзень, што яго не паслухалі, ды як узлуецца, ды як раскрычыцца! А потым прыбег пад вярбу і ўсю маёмасць Жыценя знішчыў. Нават палівачку пагнуў.

Вярнуўся Жыцень з поля, убачыў, як нашкодзіў Злыдзень, паківаў са скрухай галавою і пайшоў куды вочы глядзяць.

Не стала Жыценя пры сяле – перастала радзіць і жыта. Занепакоіліся людзі, пачалі думаць-гадаць: што рабіць? Думалі яны, думалі і надумалі: трэба Злыдня прагнаць, а Жыценя адшукаць і папрасіць, каб зноў да іх перасяліўся.

Кінуліся ганцы ва ўсе канцы, шукаюць-шукаюць, а знайсці Жыценя не могуць. Аднойчы заўважылі: поркаецца нехта ў градах пры горадзе. Падыходзяць, пытаюцца:

– Цябе, часам, не Жыценем клічуць?

– Жыценем, – адказаў дзядок. Ганцы адразу павесялелі:

– У нас просьба вялікая. У сяло вяртайся. Злыдня таго мы прагналі! А табе слова даём: ад усялякай набрыдзі бараніць будзем!..

– Добра, – згадзіўся Жыцень і патупаў услед за ганцамі.

Мінула колькі часу, і за сялом зноў жыта сцяною ўстала, зноў буйным коласам закалыхалася. А пад вярбою, у цяньку, сядзіць Жыцень і радуецца:

– Будзе жыта ўрадлівае – будзе і жыццё ў людзей багатае!..



# Паданне пра Жыцень

Жыцень – Бог восені. Беларусы здаўна ўяўлялі яго крыху грозным, нібыта вечна некім ці нечым незадаволеным. Жыцень, як гаворыцца ў павер'і, нізкага росту, худы, даволі сталага веку, з трыма вачыма, з ускудлачанымі валасамі. Ён ходзіць вельмі ціха, сагнуўшыся: расхаджвае па палях і агародах, аглядае ці добра прыбрана. Калі Жыцень знойдзе на жніўніку шмат пакінутых каласоў, збірае іх, звязаўшы ў адзін сноп, пераносіць на іншае поле, дзе ўсё сабрана чыста. Вынікам гэтага здараецца неўраджай у наступным годзе на тым месцы, дзе Жыцень знайшоў шмат пакінутых каласоў: значыць, гаспадар паленаваўся старанна папрацаваць на сваім полі. А вялікі ўраджай будзе на той ніве, дзе пакінуў Жыцень сноп.

Паводле падання, Жыцень прысутнічае таксама ў полі пры восеньскай сяўбе. У час пасеваў ходзіць Бог восені з грозным выглядам па палетках, усё прыглядаецца да чагосьці ўнізе. Гэта ён выглядае зерне і ўтоплівае яго, каб лепш увайшло ў зямлю і напоўнілася зямельнымі сокамі для добрага росту.



# Народныя забаўлянкі

## Сарока-варона

Сарока-варона
Дзеткам кашку варыла,
На прыпечку студзіла.
Гэтаму дала, гэтаму дала.
Гэтаму дала, гэтаму дала,
А гэтаму – не дала:
– А ты, мал, круп не драў,
Вады не насіў, дзяжы не мясіў.
Ідзі, малы, па вадзіцу,
Табе кашка на паліцы
У маленькай чарапіцы.



## Ладу-ладу-ладкі

Ладу-ладу-ладкі,
Пабіліся бабкі
За камочак цеста
Ды пасярод места;
Селі ў запечку,
З’елі перапечку.
Засталіся крошкі
Іх паелі кошкі.



## Кую-кую ножку

Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Дарожка крывая,
Кабылка сляпая,
На дарожцы слізка,
А дамоў няблізка.



## Гоп-гоп, і-га-га

Гоп-гоп, і-га-га.
На буланцы едзе Янка,
Паўтараста рублей санкі,
Пяцьдзесят рублей дуга.
А кабылка паўрубля.
Гоп-гоп, і-га-га.



# Народныя лічылкі

## Раз, два, тры, чатыры

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

## Каціласся торба

Каціласся торба
З вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, паляніца.
З кім ты хочаш
Падзяліцца?

## Энікі-бэнікі

Энікі-бэнікі,
Елі варэнікі.
Энікі-бэнікі.
Клёц!

